ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_______ А.Б.Заблоцкі
"8" лістапада 2022 г.

ЗАДАННІ
для правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА

Дата правядзення: 20 лістапада 2022 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 13.00.

IX клас

Заданні	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	Усяго
Балы											

Заданне 1. У "Слоўніку лінгвістычных тэрмінаў" чытаем: "Пры складападзеле ўлічваецца закон узрастання гучнасці (самыя гучныя – галосныя гукі, за імі ідуць [й] і [ў], затым санорныя; найменшую гучнасць маюць шумныя зычныя, асабліва глухія), г. зн. замыкаюць склады галосныя, а таксама санорныя, калі за імі ідуць шумныя. Зычныя [й] і [ў] замыкаюць склады ў любым выпадку пры спалучэнні зычных".

Гэта інфармацыя дапаможа вам правільна падзяліць на склады назвы гарадоў, якія ў розныя гады былі сталіцамі Дня беларускага пісьменства. Пры падзеле на склады выкарыстоўвайце вертыкальную лінію |.

УВАГА: назвы двух гарадоў, якія не былі сталіцамі Дня пісьменства, дзяліць на склады не трэба!

Максімальная колькасць балаў – 6.

Смаргонь	Ганцавічы	Орша
Магілёў	Заслаўе	Навагрудак
Нясвіж	Паставы	Добруш
Мсціслаў	Хойнікі	Вільнюс

Заданне 2. У беларускім алфавіце 32 літары. Выдзелім у ім такія групы літар:
1) з першай па дзясятую ўключна,
2) з адзінаццай па дваццатую ўключна,
3) з дваццаць першай па трыццатую ўключна.

З літар кожнай групы складзіце словы ўказаных часцін мовы і запоўніце пустыя месцы ў табліцы.

Заўвага: літары ў слове не павінны паўтарацца.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Група літар	Словы, якія складаюцца з літар пэўнай групы		
	назоўнік (у пачатковай форме)	лічэбнік (у пачатковай форме)	прыслоўе
1–10			
11–20			
21–30			

Заданне 3. Гісторыя і культура старажытнага свету сталі крыніцай шматлікіх устойлівых выразаў, якія шырока выкарыстоўваюцца ў розных еўрапейскіх мовах. Перакладзіце некалькі такіх выразаў на беларускую мову, замяняючы, дзе трэба, малую літару вялікай.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Фразеалагізм на рускай мове	Фразеалагізм на беларускай мове
ариаднина нить	
до греческих календ	
колосс на глиняных ногах	
между сциллой и харибдой	
оседлать пегаса	
сизифов труд	

Заданне 4. Адгадайце слова, ведаючы яго лексічнае значэнне і адну з марфем, якая ўваходзіць у яго склад.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Слова	Лексічнае значэнне	Адна з марфем
	‘пакуль не сцямнела, да надыходу цемнаты’	прыстаўка, як у слове *зараней*
	‘невялікая вузкая вуліца, якая злучае дзве іншыя вуліцы’	суфікс, як у слове *абгарак*
	‘прадмет мэблі ў выглядзе невысокай шафы з шуфлядамі для бялізны’	канчатак, як у слове *шафа*
	‘пёры’	суфікс, як у слове *звяр’ё*
	‘які ўтварае рып’	суфікс, як у слове *зманлівы*
	‘дзіцяня слана’	канчатак, як у слове *шчанё*

Заданне 5. Канчаткі назоўнікаў роднага і меснага склонаў адзіночнага ліку, як правіла, складаюцца з аднаго галоснага гука. Размяркуйце прапанаваныя назоўнікі ў табліцы ў залежнасці ад канчаткаў у названых формах: *боль, зубраня, каваль, кішка, маянэз, футра.*

Максімальная колькасць балаў – 6.

Канчатак назоўніка	Назоўнікі, якія маюць такі канчатак у родным склоне	Назоўнікі, якія маюць такі канчатак у месным склоне
[а]		
[і]		
[у]		
[ы]		
[э]		

Заданне 6. Дапоўніце фармулёўкі правіл тэарэтычнымі звесткамі або прыкладамі.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Дзеепрыметнік разам з ________________ ад яго словамі называецца дзеепрыметнікавым зваротам. Ён з'яўляецца адным членам сказа – развітым ___________________.

Дзеепрыметнікі маюць такія самыя канчаткі, як і ______________ з асновай на ________________ (*моцны*) і зацвярдзелы (______________) зычныя.

Дзеепрыметнікі _________________ стану абазначаюць прымету такога прадмета, які сам утварыў дзеянне: ______________ *валасы.*

Дзеепрыметнікі мужчынскага роду маюць толькі ______________ форму з канчаткам **-ы**. ________________ дзеепрыметнікі ў сказе выступаюць звычайна ў ролі ______________: *Заданне* ________________. *Кветкі* ______________.

Заданне 7. Перад вамі фрагмент аповесці, любімай многімі пакаленнямі беларускіх школьнікаў. І не дзіва, бо сёлета гэты твор адзначае сваё 85-годдзе. Пазнаёмцеся з фрагментам і ацаніце правільнасць сцвярджэнняў у табліцы.

Максімальная колькасць балаў – 6.

(1) А пачалося ўсё раніцой. (2) Яшчэ не паднялося сонца, яшчэ клубіўся туман над палянамі, як заварушылася Мішкава матка, грузна ўзнялася на пярэднія лапы. (3) Потым, зяхнуўшы, стала на ўсе чатыры, шумна атрэслася ад моху, ад сухога лісця і падалася наверх з цёмнай бярлогі. (4) Бачыў Мішка, як стаяла яна на краі бярлогі і, выцягнуўшы галаву, удыхала трапяткой і гарачай наздрынай свежае паветра раніцы, потым павяла кругом галавой і замерла на якую хвіліну – прыслухалася. (5) Ціха пранесліся над палянай качкі, пралапацеў крыллямі цецярук –

аж аблізнулася матка, уздыхнула. (6) Тады Мішку зрабілася сумна. (7) Мо таму, што ў бярлозе, пад вялікім яловым вываратнем, было цемнавата, мо таму, што без маткі рабілася холадна і няўтульна. (8) І Мішка паціху заскуголіў.

№	Сцвярджэнне	так	не
узор	Аповесць называецца “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”.	+	
1	Аўтар гэтага тэксту Уладзімір Караткевіч.		
2	Сказ №1 безасабовы.		
3	Сказ №2 складаназалежны.		
4	У сказе №6 састаўны дзеяслоўны выказнік.		
5	У сказе №7 ёсць пабочныя словы.		
6	У сказе №7 сродкам сувязі паміж часткамі сказа з’яўляецца злучнік *што*.		
7	У сказе №4 ёсць адасобленае азначэнне.		
8	У сказе №5 выкарыстана інверсія.		
9	У сказе №5 такі від падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні, як прымыканне, сустракаецца часцей за іншыя.		
10	Сказ №7 ускладнены аднароднымі акалічнасцямі.		
11	У сказе №3 выкарыстана акалічнасць мэты.		
12	Сказ №3 няпоўны.		

Заданне 8. Устаўце патрэбныя літаратуразнаўчыя тэрміны ў наступны тэкст.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Паэзія і ________________ – два розныя віды мастацкай творчасці. А яшчэ мастацкія творы падзяляюцца паводле спосабу адлюстравання жыцця на асобныя ________________: эпас, лірыку і драму. Існуюць творы, у якіх лірычны і эпічны спосабы адлюстравання жыцця маюць аднолькава важнае значэнне. Такія творы называюць ______________________. Напрыклад, ________________ “Маці” Аркадзя Куляшова, ________________ “Магіла льва” Янкі Купалы, ________________ “Ганарысты Парсюк”.

Заданне 9. Запішыце радок, які ў вершы знаходзіцца пасля запісанага ў слупку “Урывак з верша”. Вызначце назву твора і яго аўтара.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Урывак з верша	Назва твора	Аўтар
Аб ёй мне будзіць успамін ________________________________		

Каб душою ты стаў чысцей ________________________		
А ён, жэўжык-пястун, ________________________		
Чалавек – калі страчвае здольнасць Здзіўляцца і захапляцца ________________________		

Заданне 10. Складзіце зборнік твораў Якуба Коласа. Зборнік павінен мець арыгінальную (нестандартную, нечаканую) назву (запішыце яе на вокладцы), змест (пералік) твораў (іх павінна быць не менш за пяць, запішыце на старонках разгорнутай кнігі) і анатацыю, у якой неабходна ўказаць, што аб'ядноўвае гэтыя творы (акрамя аўтарства і адлюстравання жыцця беларусаў), для каго прызначаны зборнік.

Максімальная колькасць балаў – 6





Анатацыя

II ЭТАП XXXIX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ

9 клас

Заданні	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	**Усяго**
Балы	6	6	6	6	6	6	6	6	6	6	60

Заданне 1.

Смар|гонь	Ган|ца|ві|чы	Ор|ша
~~Магілёў~~	За|слаў|е	На|ва|гру|дак
Ня|свіж	Па|ста|вы	До|бруш
Мсці|слаў	Хой|ні|кі	~~Вільнюс~~

За кожнае правільна падзеленае па складах слова – 0,5 б. За веданне гарадоў, якія не былі сталіцамі Дня пісьменства (Магілёў, Вільнюс), па 0,5 б.

Заданне 2.

Група літар	Словы, якія складаюцца з літар пэўнай групы		
	назоўнік (у пачатковай форме)	лічэбнік (у пачатковай форме)	прыслоўе
1–10	*дзіва*	*два*	*дзе*
11–20	*порт*	*сто*	
21–30	*чэх*		

За кожны правільны адказ – 1 бал. Прапанаваныя вучнямі адказы могуць адрозніваца ад пададзеных тут.

Заданне 3.

Фразеалагізм на беларускай мове
арыядніна ніць
да грэчаскіх календаў (каляд)
калос на гліняных нагах
паміж (між) Сцылай і Харыбдай
асядлаць Пегаса
сізіфава праца

За кожны правільны адказ – 1 бал.

Заданне 4.

Слова	Лексічнае значэнне	Адна з марфем
завідна або *засветла*	‘пакуль не сцямнела, да надыходу цемнаты’	прыстаўка, як у слове *загадзя*
завулак	‘невялікая вузкая вуліца, якая злучае дзве іншыя вуліцы’	суфікс, як у слове *абгарак*
камода	‘прадмет мэблі ў выглядзе невысокай шафы з шуфлядамі для бялізны’	канчатак, як у слове *шафа*
пер’е	‘пёры’	суфікс, як у слове *звяр’ё*
рыплівы	‘які ўтварае рып’	суфікс, як у слове *зманлівы*
сланянё	‘дзіцяня слана’	канчатак, як у слове *шчанё*

За кожны правільны адказ – 1 бал.

Заданне 5.

Канчатак назоўніка	Назоўнікі, якія маюць такі канчатак у родным склоне	Назоўнікі, якія маюць такі канчатак у месным склоне
[а]	*каваль, футра*	
[і]	*зубраня, кішка*	*зубраня, боль*
[у]	*боль, маянэз*	*каваль*
[ы]		*футра, кішка*
[э]		*маянэз*

За кожны правільны адказ – 0,5 бала.

Заданне 6.

Дзеепрыметнік разам з **залежнымі** ад яго словамі называецца дзеепрыметнікавым зваротам. Ён з’яўляецца адным членам сказа – развітым **азначэннем**.

Дзеепрыметнікі маюць такія самыя канчаткі, як і **прыметнікі** з асновай на **цвёрды** (*моцны*) і зацвярдзелы (*свежы*) зычныя.

Дзеепрыметнікі **незалежнага** стану абазначаюць прымету такога прадмета, які сам утварыў дзеянне: *пасівелыя валасы*.

Дзеепрыметнікі мужчынскага роду маюць толькі **поўную** форму з канчаткам *-ы*. **Кароткія** дзеепрыметнікі ў сказе выступаюць звычайна ў ролі **выказніка**: *Заданне выканана. Кветкі паліты.*

За кожны правільны адказ – 0,5 бала. Прапанаваныя вучнямі прыклады (выдзелены курсівам) могуць адрознівацца ад пададзеных тут.

Заданне 7.

№	Сцвярджэнне	так	не
1	Аўтар гэтага тэксту Уладзімір Караткевіч.		+
2	Сказ №1 безасабовы.		+
3	Сказ №2 складаназалежны.		+
4	У сказе №6 састаўны дзеяслоўны выказнік.		+
5	У сказе №7 ёсць пабочныя словы.	+	
6	У сказе №7 сродкам сувязі паміж часткамі сказа з'яўляецца злучнік *што*.	+	
7	У сказе №4 ёсць адасобленае азначэнне.		+
8	У сказе №5 выкарыстана інверсія.	+	
9	У сказе №5 такі від падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні, як прымыканне, сустракаецца часцей за іншыя.		+
10	Сказ №7 ускладнены аднароднымі акалічнасцямі.		+
11	У сказе №3 выкарыстана акалічнасць мэты.		+
12	Сказ №3 няпоўны.	+	

За кожны правільны адказ – 0,5 бала.

Заданне 8.

1) проза
2) роды (літаратурныя роды)
3) ліра-эпічнымі
4) балада
5) паэма
6) байка

За кожны правільны адказ – 1 бал.

Заданне 9.

Урывак з верша	Назва твора	Аўтар
Аб ёй мне будзіць успамін *На ліпе бусел клёкатам.*	*"Спадчына"*	*Янка Купала*
Каб душою ты стаў чысцей *І не страціў святое штосьці.*	*"Трэба дома бываць часцей"*	*Рыгор Барадулін*
А ён, жэўжык-пястун, *Гучным смехам дрыжыць.*	*"Ручэй"*	*Якуб Колас*
Чалавек – калі страчвае здольнасць Здзіўляцца і захапляцца *Жыццём.*	*"Дрэвы паміраюць"*	*Максім Танк*

За кожны правільны адказ – 0,5 бала.

Заданне 10. Ацэнку гэтага задання неабходна праводзіць сумарна па трох параметрах: назва, змест, анатацыя. Агульны сумарны бал – 6.

Ацэнка назвы:

Колькасць балаў	*Крытэрый*
1	*Дадзена арыгінальная назва, якая суадносіцца са зместам зборніка. Важна ўлічыць, што арыгінальная назва – назва нечаканая, якая сутнасна не паўтараецца ў правяраемай групе.*
0	*Назва не вызначаецца арыгінальнасцю.* *АБО* *Назва поўнасцю паўтарае назву зборніка Якуба Коласа.* *АБО* *Назва адсутнічае.*

Ацэнка зместу:

Колькасць балаў	*Крытэрый*
2	*Названа не менш за пяць розных твораў Якуба Коласа. Усе назвы пададзены правільна. Нельга залічваць як розныя творы ўрывак і цэлы твор (напрыклад, "Новая зямля" і "Дзядзька-кухар" – адзін твор). Творы іншых аўтараў адсутнічаюць.*
1	*Названы тры ці чатыры розныя творы Якуба Коласа. Усе назвы пададзены правільна. Творы іншых аўтараў адсутнічаюць.* *АБО* *Названа не менш за пяць розных твораў Якуба Коласа. Усе назвы пададзены правільна. Таксама названы творы, якія не належаць Якубу Коласу.* *АБО* *Названы не менш за пяць розных твораў Якуба Коласа. У назвах маюцца памылкі (напрыклад, замест "Новая зямля" напісана "На новай зямлі"). Творы іншых аўтараў адсутнічаюць.*
0	*Названа менш за тры творы Якуба Коласа.* *АБО* *Названа не менш за пяць розных твораў Якуба Коласа, але маюцца памылкі ў назвах. Таксама названы творы, якія не належаць Якубу Коласу.* *АБО* *Адказ адсутнічае*

Ацэнка анатацыі:

Колькасць балаў	*Крытэрый*
3	*У анатацыі вытрымана ўнутраная лагічнасць; яна мае ўказанне на адрасата зборніка і тлумачыць, чаму творы аб'яднаны ў адзін зборнік.*
2	*У анатацыі вытрымана ўнутраная лагічнасць; яна мае ўказанне на адрасата зборніка або тлумачыць, чаму творы аб'яднаны ў адзін зборнік.* *АБО* *У анатацыі вытрымана ўнутраная лагічнасць; яна мае ўказанне на адрасата зборніка або тлумачыць, чаму творы аб'яднаны ў адзін зборнік (або ў тлумачэнні ўказана, што творы аб'яднаны аўтарствам ці адлюстраваннем жыцця беларусаў)*
1	*Унутраная лагічнасць анатацыі парушана; яна мае ўказанне на адрасата зборніка або тлумачыць, чаму творы аб'яднаны ў адзін зборнік.* *АБО* *Унутраная лагічнасць анатацыі парушана; яна мае ўказанне на адрасата зборніка або тлумачыць, чаму творы аб'яднаны ў адзін зборнік (або ў тлумачэнні ўказана, што творы аб'яднаны аўтарствам ці адлюстраваннем жыцця беларусаў)*
0	*Унутраная лагічнасць анатацыі парушана; няма ўказання на адрасата зборніка і тлумачэння, чаму творы аб'яднаны ў адзін зборнік.*

Заўвага да ўсёй работы: за кожную арфаграфічную, граматычную, пунктуацыйную і інш. памылку здымаецца па 0,1 бала ў заданнях, ацэненых станоўчым балам.